# РАЗДЕЛ 2
# ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ КУЛЬТУРОЛОГИИ

## КЛАСІЧНАЯ ДЫЯЛЕКТЫКА ЯК МЕТАД ВЫВУЧЭННЯ І МАДЭЛЯВАННЯ МІЖКУЛЬТУРНЫХ УЗАЕМАДЗЕЯННЯЎ

**Бабко А. І.**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*
*УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне, тэарэтычная рэканструкцыя і мадэляванне міжкультурных стасункаў можа грунтавацца на розных філасофска-метадалагічных падыходах (цікавыя вынікі дазволіла дасягнуць, напрыклад, актуалізацыя ў дадзеным кантэксце метадалагічнага патэнцыялу ідэі нелінейнасці [3]). У гэтай сувязі дапушчальна весці гаворку пра інтэлектуальнае спаборніцтва паміж рознымі даследчымі стратэгіямі на згаданым кірунку культуралагічных пошукаў (што павінна разглядацца як у найвышэйшай ступені спрыяльны фактар іх разгортавання). Варта адзначыць, што класічная дыялектыка (якая знайшла сваё найяскравейшае ўвасабленне ў творчасці Гегеля) зусім не страціла канкурэнтаздольнасці ні ў плане навуковага разгляду міжкультурнага дыялога, ні ў абсягу культуралагічных (і навуковых) даследаванняў увогуле. Магчымасць эфектыўнага ўжывання дыялектычнай метадалогіі пры вывучэнні міжкультурных дыялагічных стасункаў абумоўліваецца адпаведнасцю паміж іх працэсуальным, жывым характарам і прынцыповай скіраванасцю дыялектыкі на рух, на зменлівасць, на развіццё. Пра ўнутраную блізкасць абодвух феноменаў яскрава сведчыць і той факт, што дыялагічная форма прасоўвання да праўдзівых ведаў належыць да найважнейшых крыніц распрацоўкі згаданай метадалогіі (што фіксуецца і падкрэсліваецца наяўным у іх узаемадачыненнях этымалагічным аспектам) [7, с.33].

Найгрунтоўнейшай адзнакай дыялектычнага мыслення з'яўляецца яго мужная паслядоўнасць у раскрыцці супярэчлівасці ўсяго існага. Важна мець на ўвазе, аднак, што ў рамках гегелеўскай інтэрпрэтацыі дыялектыкі супярэчнасць, маючы найперш адмоўную натуру, выяўляе разам з тым і станоўчы бок: яна нясе ў сабе аснову свайго самапераадолення і фігуруе як крыніца ўсякага руху і развіцця. Гегель аддаваў перавагу пэўнай форме згаданага самапераадолення, якую можна ахарактарызаваць як працэсуальна-сінтэтычную: супрацьлеглыя моманты, што належаць да супярэчлівага ўтварэння, аб'ядноўваюцца ў рухомай тоеснасці, якая разгортваецца як працэс з новымі, больш высокімі характарыстыкамі, і ператвараюцца ў ідэальныя моманты гэтага працэсу. Такое вырашэнне супярэчнасці выступае ў пэўным сэнсе як вяртанне да стану, што папярэднічаў яе выяўленню і абвастрэнню.

Згаданае вяртанне, аднак, адбываецца на больш высокім узроўні: першапачатковае адзінства мае, паводле Гегеля, неразвіты характар, яно не прайшло яшчэ праз раздваенне, супрацьлегласць, бязладдзе, не зведала і не пераадолела іх. Такім чынам, у сваёй глыбокай сутнасці рэальныя працэсы выяўляюць трыядычную структуру: яны разгортваюцца ад першапачатковага станоўчага этапу праз адмоўны (супярэчлівы) да іх сінтэзу, да глыбокага, рухомага, аплодненага рознасцю адзінства. Як піша філосаф у дадзенай сувязі, “разгляд усяго існага выяўляе на ім самім, што ў сваёй аднолькавасці з сабой яно выступае як неаднолькавае і супярэчлівае, а ў сваім адрозным, у сваёй супярэчнасці – як тоеснае з сабой і што ў сабе самім яно ёсць рух пераходу аднаго гэтага вызначэння ў другое – з тае прычыны, што ў ім самім яно з’яўляецца супрацьлегласцю самога сябе” [6, с.27] (пераклад мой. – А.Б.).

Трыядычная схема дыялектычнага руху мыслення мае ў найвышэйшай ступені абстрактны характар і можа эфектыўна ўжывацца найперш пры разглядзе рэчаісных працэсаў на ўзроўні ўласцівай ім фундаментальнай дыхатаміі, самараздваення, самападзелу. У сувязі з гэтым яна можа быць выкарыстана ў першую чаргу для распрацоўкі ідэалізаваных, надзвычай адцягненых іх мадэляў, якія тым не менш маюць істотную тэарэтычную і практычную каштоўнасць: гэта мадэлі, што грунтуюцца на ідэі прагрэсіўнага развіцця і арыентуюцца на забеспячэнне адпаведнага кірунку разгортвання падзей. Іх аптымістычны аспект, аднак, непарыўна звязаны з аспектам рэалістычным: згодна з дыялектычнымі прынцыпамі рух наперад здзяйсняецца праз крызісы, праз супярэчнасці, якія неабходна вытрымаць і пераадолець, а гэта патрабуе істотных намаганняў (і ў тэарэтычным, і ў практычным плане).

Аптымізм і рэалізм дыялектычнай метадалогіі робіць яе дзейсным інструментам (які, магчыма, недаацэньваецца ў сучасных умовах) для распрацоўкі абгрунтаваных праграм вырашэння самых розных праблем, з якімі сутыкаюцца сёння чалавек і чалавецтва, у тым ліку і тых, што паўстаюць у кантэксце вывучэння і мадэлявання міжкультурных стасункаў, пошуку такіх стратэгій удзелу ў іх нацыянальнай культуры, якія найлепшым чынам забяспечвалі б яе паспяховае самаразвіццё.

Той момант, што дыялагічныя ўзаемадачыненні культур, культурных традыцый мелі і маюць надзвычай няпросты характар, падаецца відавочным (пра гэта яскрава сведчаць такія з’явы, як канфлікты, што ўвесь час паўстаюць на палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, этнічнай і рэлігійнай глебе, так званы культурны імперыялізм, пагроза збяднення агульначалавечай культуры праз страту нацыянальна-культурнай самабытнасці пэўнымі народамі, магчымасць якой абумоўліваецца сучаснымі глабалізацыйнымі варункамі і г.д.). Дыялектычная метадалогія нацэльвае не на ўцёкі ад гэтай супярэчлівай рэальнасці, а на смелае і актыўнае ўваходжанне ў яе, прасякнутае памкненнем не разгубіцца, не страціць сябе ў складанай сітуацыі, а зрабіць яе крыніцай уласнага самаразвіцця і самаўдасканалення.

Як вынікае з даведзенага вышэй, згодна з дыялектычнымі ідэямі і прынцыпамі найбольш эфектыўнымі стратэгіямі арганізацыі міжкультурных дыялагічных дачыненняў і пераадолення магчымых у іх рамках канфліктаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з’яўляюцца стратэгіі сінтэтычнага характару. У дадзенай сувязі неабходна звярнуць увагу на думку Гегеля, згодна з якой сінтэз супрацьлеглых пачаткаў, што адбываецца ў духоўным (найвышэйшым) абсягу рэчаіснасці, характарызуецца спалучэннем іх ідэалізацыі (ператварэння ў ідэальныя моманты сінтэтычнага працэсу) і іх поўнай самарэалізацыі, самавыяўленасці, захавання іх адноснай самастойнасці. Ідэальныя ў сваёй глыбокай сутнасці моманты выступаюць як самастойныя і цэласныя ўтварэнні ў сваім знешнім існаванні. (Метадалагічныя наступствы дадзенага падыходу яскрава выяўляюцца ў гегелеўскай “Эстэтыцы” [5, с.33]). Такое разуменне наяўнага ў культуры стану спраў задае пэўныя арыенціры самаразвіццю культурных традыцый, і ў адпаведнасці з ім класічная дыялектыка патрабуе не адштурхоўваць іншую карціну свету, іншы пункт гледжання, іншую ідэю, а асэнсаваць, зразумець і перапрацаваць яе на грунце ўласнай адметнасці, уласных інтарэсаў, уласнага светапогляду. Гэтыя сінтэтычныя намаганні можна лічыць удалымі, калі адпаведная культура ці культурная традыцыя выходзіць у выніку на больш высокі ўзровень самаразвіцця, набывае новую якасць.

Варта адзначыць, што гістарычны досвед чалавецтва яскрава сведчыць пра тое, што жыццяздольныя, моцныя культуры паспяхова здзяйснялі міжкультурны сінтэз, перапрацоўваючы і арганічна ўлучаючы ў свой склад напачатку варожыя, антытэтычныя, супрацьлеглыя іх сутнасці аспекты і тэндэнцыі. Узгадаем хрысціянскую традыцыю і яе ўзаемаадносіны з язычніцтвам. Хрысціянства знайшло ў сабе сілы пераадолець глыбокае непрыняцце свайго культурнага канкурэнта і задзейнічаць у сваім самаразвіцці найкаштоўнейшыя яго набыткі (так, непрымірымае варагаванне з паганскай філасофіяй саступіла месца творчай рэцэпцыі антычнай філасофскай спадчыны, што зрабілася істотным фактарам інтэнсіўнага развіцця хрысціянскай культурнай традыцыі).

Адзначым, што сінтэтычныя культуратворчыя стратэгіі зусім не чужыя і беларускаму духу (гэта абумоўлена найперш уласцівай нашай ментальнасці ідэалагічнай і рэлігійнай талерантнасцю, якая ў сваю чаргу карэніцца ў скептычным характары беларускага менталітэту [2, с.108-112]). Так, канстатуючы наяўнасць ваганняў нашага народа паміж Усходам і Захадам, І. Абдзіраловіч указвае, што “жыцьцё вымагала сінтэзу, згарманізаваньня абодвух кірункаў”, і разам з тым з жалем заўважае, што такі сінтэз зрабіўся немагчымым [1, с.15]. Тым не менш мысляр перакананы, што сітуацыя павінна змяніцца і фактычна мяняецца, што адпаведныя змяненні абуджаюць беларускі народ і клічуць яго “ісьці пароўну з іншым на будоўлю агульначалавечага ідэалу” [1, с.11]. На думку філосафа, такім чынам, у якасці асновы сінтэтычных культуратворчых практык павінна фігураваць гарманічнае злучэнне агульначалавечага і адметнага культурных пачаткаў. Надзвычай важна, што І. Абдзіраловіч імкнецца ўзяць чынны ўдзел у вырашэнні задач, пастаўленых перад беларусамі гісторыяй. Пры гэтым мы бачым, што ў яго творчых пошуках значная роля належыць якраз сінтэтычным інтэлектуальным стратэгіям, скіраваным на ўлучэнне ў беларускі кантэкст набыткаў сусветнай культуры (у першую чаргу культуры філасофскай; і ў дадзенай сувязі нельга не адзначыць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ён зусім не ігнаруе дыялектычную традыцыю: да сваіх аднадумцаў ён прылічвае, напрыклад, Геракліта, які разглядаецца ім як своеасаблівы папярэднік філасофіі жыцця [1, с.19]).

Засяроджанасць на сінтэтычных стратэгіях культуратворчасці яскрава выяўляецца і ў даследаваннях сучасных беларускіх навукоўцаў. Так, Ул.Конан падкрэслівае, што адмоўныя наступствы глабалізацыйных працэсаў могуць быць пераадоленыя ці прадухіленыя праз сінтэз універсальнага і нацыянальнага пачаткаў у развіцці культуры (пра які вёў гаворку і І.Абдзіраловіч). Філосаф выказвае гэтую думку з максімальнай яснасцю і выразнасцю: "Сутнасць маёй пазіцыі – у гарманізацыі *універсальнага і нацыянальнага, універсалізму і нацыяналізму* ў пазітыўным значэнні гэтых паняццяў" (курсіў аўтара – А.Б.) [2, с.10].

У сучасных культуралагічных тэкстах разглядаюцца і сінтэтычныя мадэлі дыялагічных практык нашага народа. Адзначым, што часам у іх выказваецца нязгода з пазіцыяй І. Абдзіраловіча, якая набывае ў некаторых аўтараў катэгарычнае і недвухсэнсоўнае гучанне. Так, Э. Дубянецкі піша: "На мой погляд, беларускі народ не "вагаўся" паміж Захадам і Усходам і тым больш не меў да іх "шчырай непрыхільнасці", а наадварот, развіваў сваю самабытную культуру на аснове ўспрыняцця і творчай перапрацоўкі стваральных уплываў заходняй і ўсходняй цывілізацый" [2, с.17]. Аналагічнага пункту гледжання прытрымліваецца і А. Суша. Ён разглядае згаданую праблематыку ў кантэксце культуратворчай дзейнасці вуніяцкай царквы і без усякіх сумненняў даводзіць пра сінтэз усходне- і заходнехрысціянскіх традыцый у беларускай культуры [4, с.2].

У дадзенай сувязі варта падкрэсліць, аднак, што культуратворчы сінтэз не можа быць канчатковым, як не можа знайсці свайго канчатковага, абсалютнага завяршэння сама культуратворчасць і сам міжкультурны дыялог. Таму сінтэтычныя стратэгіі культурнага будаўніцтва заўжды будуць актуальнымі і перад культурнымі традыцыямі заўжды будуць стаяць складаныя творчыя задачы адпаведнага кшталту. Гэта азначае, аднак, што не страціць свайго грунтоўнага значэння ў кантэксце даследавання, мадэлявання і практычнай арганізацыі міжкультурных стасункаў і дыялектычная метадалогія.

Падсумоўваючы даведзенае вышэй, неабходна найперш указаць, што класічная дыялектыка не толькі арыентуе ўдзельнікаў міжкультурнага дыялога на здзяйсненне ў яго абсягу сінтэтычных культуратворчых стратэгій, але і выяўляе крытэрый сапраўднага, грунтоўнага, плённага сінтэзу разнастайных культурных тэндэнцый, кірункаў і ўплываў. Як вынікае з ключавых прынцыпаў дадзенай метадалагічнай пазіцыі, сінтэтычны падыход можна прызнаць паспяховым у тым выпадку, калі яго ўжыванне выводзіць пэўную культуру ці культурную традыцыю на новы, больш высокі ўзровень, у рамках якога згаданыя ўплывы выступаюць як ідэалізаваныя і перапрацаваныя моманты. Неабходна таксама адзначыць істотнае значэнне ў кантэксце вывучэння, малэлявання і практычнай арганізацыі міжкультурных узаемадзеянняў глыбокага рэалізму дыялектычнай метадалогіі, згодна з якой згаданыя ўзаемадзеянні зусім не з'уляюцца ідылічнымі: таму шлях да высокага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага сінтэзу вядзе праз вострыя калізіі, канфлікты і супярэчнасці. Той факт, што дадзеная – мужная і творчая – метадалогія была і застаеца запатрабаванай у беларускай культурнай прасторы, яскрава засведчаны яе гісторыяй і станам рэчаў на сучасным этапе яе самаразвіцця.


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. Нацыянальныя пытанні: матэр. III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – 224 с.

3. Можейко, М.А. Диалог культур: актуальные проблемы методологии исследования / М.А. Можейко // XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 21-24 мая 2009 г.): матэр. чыт. / рэдкал.: Б.У. Святлоў (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – С.28-41.

4. Суша, А.А. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі “Усход–Захад” : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі / А.А. Суша. – Мінск: БДУКМ, 2009. – 26 с.

5. Hegel, G.W.F. Ästhetik: in 2 B. / G.W.F.Hegel. – 3. Aufl. – B.1. – Berlin, Weimar: Aufbau-Verlag, 1976. – 591 S.

6. Hegel, G.W.F. Wissenschaft der Logik: in 2 Teilen / G.W.F.Hegel. – Berlin: „Akademie-Verlag“, 1975. – T.2. – 511 S.

7. Simon-Schaefer, R. Dialektik / R.Simon-Schaefer // Handlexikon zur Wissenschaftstheorie / hrsg. Von H.Seiffert und G.Radnitzky. – München: Ehrenwirt, 1989. – S. 33-36.


## ПОНЯТИЕ И СУЩНОСТЬ СОВРЕМЕННОГО МЕДИАПРОСТРАНСТВА: ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ВОПРОСЫ


**Волков В. А.**

*магистр культурологии, аспирант кафедры культурологии*
*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*
*(Республика Беларусь, г. Минск)*


Пространство человеческого бытия имеет множество ипостасей, поскольку реальная действительность может быть представлена с помощью большого количества подпространств, описывающих соответствующие сферы объективной реальности. В условиях виртуализации социальных отношений и процессов медиаконвергенции, происходит формирование новой реальности – медиареальности. Это обуславливает необходимость уточнения и выявления сущности понятия «медиапространство».

В связи с этим считаем актуальным выявить основные характеристики медиапространства как явления, связанного с формированием новой социальной реальности, основываясь на культурологическом осмыслении данного феномена с позиций различных подходов.

Анализ работ по данной проблематике показал, что в современных исследованиях, касающихся репрезентации понятия «медиапространство»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ